КУПАЛЬСКІЯ ФАРБЫ АЛЕКСАНДРЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён падкрэсліў, што дадзенае звыш адзінства народы сумелі захаваць. Стагоддзе за стагоддзем, год за годам яны звярталіся да сваіх вытокаў, сябравалі, стваралі сем'і. Таму Александрыя запрашае ўсіх на свята не толькі як блізкіх суседзяў, але і як родных людзей.

Прэзідэнт не ўтойвае: ён з задавальненнем прыязджае ў любы куток нашай краіны — гэта яго велізарная радзіма, якую ён любіць усім сэрцам. Але асаблівыя эмоцыі адчувае, калі бывае на Купаллі ў Александрыі.

Малая радзіма ў кожнага свая — ці вёска, ці горад, ці мегаполіс. Але, на думку Аляксандра Лукашэнкі, двухмільённы Мінск цяжка асацыяваць з малой радзімай.

«Таму я ўсім кажу: хай мая малая радзіма будзе і вашай. Кожны, хто заклапочаны — дзе ж яго малая радзіма, лічыце, што тут. І калі вы будзеце штогод сюды прыязджаць, на гэтую нашу з вамі малую радзіму, яна будзе любіць вас так, як любіць мяне», — запрасіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што самабытнае свята «Александрыя збірае сяброў» дапамагае ўсвядоміць сябе адным з важных звенняў бесперапыннага ланцужка пакаленняў беларусаў, перадаць дзецям тое, што нам пакінулі ў спадчыну бацькі, захаваць нацыянальную самаідэнтычнасць, традыцыі, культуру, а значыць — і сваю родную зямлю.

Адкрываючы фестываль, Прэзідэнт нагадаў старажытную народную легенду, згодна з якой таму, хто на Купалле знойдзе папараць-кветку, адкрыюцца ўсе скарбы зямлі. Александрыя ж з чыстым сэрцам прапануе кожнаму госцю свае самыя каштоўныя скарбы — культурныя, духоўныя, рамесныя і кулінарныя. І дапаўняе іх славутай беларускай гасціннасцю.

* * *

Дождж і вецер не перашкодзілі рабоце рэспубліканскага фэсту «Купалле». Сёлета ён праходзіў у Александрыі дзясяты раз і быў прысвечаны трохгоддзю малой радзімы. Акрамя прадстаўнікоў усіх куточкаў Беларусі, у ім узялі ўдзел дэлегацыі з Расіі, Украіны, Эстоніі, Літвы, Латвіі, Польшчы.

— Гэтае свята ідзе ад нашых продкаў, яго адзначаюць і ў іншых краінах, але з такой сардэчнасцю і размахам святкуюць толькі ў нас. Нездарма папараць-кветка стала ключавым талісманам другіх Еўрапейскіх гульняў. Кожны беларус трымае ў сваім сэрцы пачуццё малой радзімы. І тыя слаўныя традыцыі, якія мы тут дэманструем, вельмі важныя і неабходныя для будучыні нашай краіны, — адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра краіны, старшыня аргкамітэта фестывалю Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

Кіраўнік Магілёўскай вобласці Леанід ЗАЯЦ падкрэсліў значнасць свята і патлумачыў цікавасць да яго з боку народаў суседніх краін тым, што яно «аб'ядноўвае роднасныя душы славянскіх народаў».

Купальскае свята славіцца сваёй душэўнасцю, народнасцю, аўтэнтычнасцю. Яно быццам жывая ілюстрацыя да летапісу слаўнай мінуўшчыны і сучаснасці Беларусі, яе стасункаў з іншымі народамі і нацыянальнасцямі, яскравае сведчанне добрасуседскіх узаемаадносін з рознымі краінамі, гераічнасці беларускага народа. На вялікай маляўнічай пляцоўцы сканцэнтравалася ўсё тое, чым па праве ганарыцца Беларусь: яе дасягненні ў культуры, спорце, навуцы, сельскай гаспадарцы, аўтамабілебудаванні.

Шматлюдна было на пляцоўцы імправізаванага кніжнага двара. Народ ішоў сюды на сустрэчу з пісьменнікамі, паэтамі, прадстаўнікамі часопісаў і газет, у тым ліку выдавецкага дома «Звязда».

Паэтка Жанна МІУС сабрала вакол сябе прыхільнікаў дзіцячай літаратуры. У выдавецкім доме «Звязда» выйшла яе кніга «Дзіўныя дзеткі». Аўтарка ў гумарыстычных вершах расказвае пра маленькіх, ужываючы жартоўныя слоўцы.

— За некалькі гадзін прадалі практычна ўсё, што было, — усміхаецца паэтка. — Гэта мая дэбютная кніжка, і прыемна, што яна ўжо намінаваная на Нацыянальную літаратурную прэмію. А хутка ў гэтым жа выдавецтве выйдзе мая новая кніжка для дзяцей.

Яркім суквеццем народных строяў і арыгінальных вырабаў вабілі імправізаваныя вуліцы беларускіх і замежных майстроў і рамеснікаў.

— Я на свяце ўжо ў трэці раз, яно мне вельмі падабаецца, — прызнаецца

Майстрыха з Ваўкавыскага раёна прадставіла рэгіянальнае ткацтва.

Яніна Вацлаваўна, ткачыха з Гродзенскай вобласці, член Саюза мастакоў Беларусі. Яе дываны з лёну, нітак і стужак, нягледзячы на даволі адчувальны кошт — 15 рублёў за метр, карысталіся поспехам. Маладая дзяўчына купіла невялікі кавалачак для, як яна патлумачыла, заняткаў фітнесам. Некаторыя бралі на пакрывалы і нават... на жалюзі.

— Толькі магілёўскіх прадстаўнікоў тут прысутнічае 300 чалавек, — заўважае **Валянціна ВАЛЧКОВА, начальнік інфармацыйна-аналітычнага і рэпертуарна-выдавецкага аддзела абласнога метадычнага цэнтра.** — Прыехала шмат удзельнікаў з Расіі, некаторыя з іх упершыню пабывалі ў нашай краіне летась, на Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, і ім так спадабалася, што пажадалі вярнуцца.

Кожная вобласць Беларусі прывезла свой брэнд. Напрыклад, Гродзеншчына дэманстравала «Фестываль нацыянальных культур», Брэстчына — «Мотальскія прысмакі», Гомельшчына — свае знакамітыя «Аўцюкі».

Упершыню ў такім вялікім складзе на свята прыехалі прадстаўнікі рэканструктарскіх клубаў з Мінска. Ваенна-гістарычны клуб «Веруш», напрыклад, займаецца рэканструкцыяй гарадскога апалчэння польскага горада Вяршоў і часоў ВКЛ.

Цікава было паглядзець на сучасную тэхніку Мінскага трактарнага завода, наведаць перасовачны цыркшапіто SIRIUS, маляўнічы шацёр якога вабіў дзяцей і дарослых яшчэ з вакна цягніка. А песень было столькі, што музыканты не маглі прыпыніцца, нават калі ехалі ў цягніку — прынамсі да Магілёва. Калі падпявае ўвесь вагон, у гэтым нешта ёсць.

Гімнам малой радзіме стаў гала-канцэрт з удзелам Анатоля Ярмоленкі, Аляксандра Саладухі, Іны Афанасьевай, Алены Ланской, Іскуі Абалян, Льва Лешчанкі, Ціны Караль. Пасля шоу неба на працягу дзесяці хвілін расквечвалі святочны феерверк і лазернае шоу.

Купальская дыскатэка грымела да трох гадзін раніцы. Новы святочны дзень быў прысвечаны ўшанаванню работнікаў АПК. Найлепшыя з найлепшых атрымалі заслужаныя ўзнагароды за значны асабісты ўнёсак у сельскагаспадарчую галіну вобласці і ў цэлым краіны. А музычным падарункам для іх стаў канцэрт Анатоля Ярмоленкі і ансамбля «Сябры». На купальскіх пляцоўках працягвалі працаваць майстар-класы, у тым ліку па масажы, паранні ў лазні, рэлакс-тэрапіі, вегетарыянскім харчаванні, арганізацыі актыўнага адпачынку, мылаварэнні. Адбыліся маладзёжны квэст і фестываль фарбаў. І толькі пад вечар купальскі фестываль сказаў сваім гасцям і наведвальнікам: да сустрэчы ў новым годзе.

Варвара МАРОЗАВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ МІРНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

Афіцыйнае паведамленне прэс-службы Прэзідэнта Беларусі

У сувязі са шматлікімі пытаннямі ад прадстаўнікоў СМІ з нагоды заявы Прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага, у якой ён прапанаваў арганізаваць у Мінску міжнародную сустрэчу з удзелам лідараў Украіны, Расіі, ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, інфармуем, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, вядома, ужо знаёмы з заявай кіраўніка ўкраінскай дзяржавы. Адразу хочам адзначыць — нічога новага ў палітыцы Прэзідэнта Беларусі, у яго адносінах да канфлікту ва Украіне няма, а таму:

1. Наш Прэзідэнт абсалютна падтрымлівае прапановы Уладзіміра Зяленскага. Гэта пазіцыя нязменная, і заключаецца яна ў тым, што нельга глядзець адно на аднаго праз прыцэл гармат, трэба сядаць і вырашаць праблемы, якіх назбіралася нямала.

2. Што датычыцца агучаных прапаноў па ўдзельніках сустрэчы, то ўсе, напэўна, памятаюць: Прэзідэнт нашай краіны неаднаразова казаў, што «гэтую праблему павінны вырашыць мы — тры славянскія народы. Не еўрапейцы, не амерыканцы, а менавіта мы, каб яна не была замарожаная па прыкладзе іншых гарачых кропак на постсавецкай прасторы» (пра гэта, у прыватнасці, ішла размова на Форуме рэгіёнаў Беларусі і Украіны ў мінулым годзе). Але калі вырашыць праблему ў такім фармаце не атрымліваецца і адзін з бакоў канфлікту — у дадзеным выпадку Украіна — настойвае і прапануе ўдзел і іншых гульцоў, мы такі фармат падтрымліваем таксама... Тым больш што і пра ўдзел ЗША ў вырашэнні дадзенага канфлікту Аляксандр Лукашэнка ўжо даўно казаў — без амерыканцаў вырашыць гэтую праблему будзе складана, занадта яны пагружаныя ў дадзеныя працэсы.

3. Ну і наконт месца правядзення сустрэчы... Тут і зусім двух меркаванняў быць не можа: вайна каля нашага парога, і ў Мінску заўсёды лічылі і лічаць за гонар быць пляцоўкай для мірных ініцыятыў і перагавораў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Грэцыю ўзначаліў банкір

Лідар грэчаскай партыі «Новая дэмакратыя», якая перамагла на парламенцкіх выбарах, Кірыякас Міцатакіс прыняў прысягу ў якасці прэм'ер-міністра Грэцыі, паведамляе Reuters.

Урачыстая цырымонія адбылася ў прэзідэнцкім палацы ў Афінах. Чакаецца, што ў хуткім часе Міцатакіс абвесціць склад урада. Наперадзе яго чакае барацьба за выкананне перадвыбарных абяцанняў: былы банкір ішоў на выбары з мэтай панізіць падаткі, стварацьь рабочыя месцы і паляпшаць інвестыцыйны клімат.

Правацэнтрысцкая партыя «Новая дэмакратыя», якую ён узначальвае, 7 ліпеня набрала на парламенцкіх выбарах каля 40 працэнтаў галасоў, абагнаўшы левую партыю СІРЫЗА, якая кіравала з 2015 года. Выбары ў краіне прайшлі датэрмінова, бо кіруючая партыя прайграла на выбарах у Еўрапарламент.

У 2010 годзе Грэцыя сутыкнулася з даўгавым крызісам, які выліўся ў маштабную праграму фінансавай падтрымкі з боку Еўрапейскага саюза, якая скончылася толькі ў 2018-м. За час крызісу краіна рэзка скарацілa дзяржаўныя выдаткі, пенсіі і сацыяльныя дапамогі, павысіла пенсійны ўзрост.

Іран расказаў пра наступныя крокі да ядзернай бомбы

Іран плануе зноў запусціць цэнтрыфугі, якія былі дэактываваны, і рэзка павысіць узровень узбагачэння ўрану ў рамках далейшага адыходу ад умоў Сумеснага ўсёабдымнага плана дзеянняў (СУПД). Такую заяву зрабіў у панядзелак прадстаўнік Арганізацыі па атамнай энергіі Ірана (ААЭІ) Бехруз Камальвандзі, перадае Reuters.

Пасля ўключэння цэнтрыфуг Ісламская Рэспубліка здольная дасягнуць 20 працэнтаў узбагачэння ўрану і больш — але «ўсяму свой час», сказаў Камальвандзі. Новы, ужо трэці крок па адыходзе ад здзелкі плануецца здзейсніць на працягу бліжэйшых 60 дзён. Камальвандзі таксама пацвердзіў, што Іран перавысіў дапушчальны па СУПД узровень у 3,67 працэнта і на дадзены момант дасягнуў 4,5 працэнта.

Пра гэта стала вядома 7 ліпеня. На думку міністра энергетыкі Ізраіля Юваля Штайніца, такі план узбагачэння ўрану — умераны крок, аднак Іран «пачаў нялёгкі шлях да ядзернай зброі».

Вучоныя прадставілі тэст, які ставіць дыягназ у рэкордныя тэрміны па дыханні чалавека

Як адзначае Express, высокую эфектыўнасць дыягностыкі можна растлумачыць тым, што аналіз робіцца на ўзроўні наначасціц. Таксама тут выкарыстоўваецца штучны інтэлект для выяўлення асаблівых рэчываў (біямаркераў), якія выдзяляюцца пры розных захворваннях. Раней атрымлівалася зафіксаваць гэтыя рэчывы толькі ў вялікай канцэнтрацыі, гэта значыць калі хвароба ўжо актыўна развіваецца.

Спачатку сістэму праверацьь на раку лёгкіх. Але, па словах навукоўцаў, яна можа дыягнаставаць іншыя тыпы раку, сухоты і нават дэменцыю. У хуткім часе павінны быць праведзены клінічныя выпрабаванні сістэмы. Калі ўсё складзецца ўдала, сістэма з'явіцца на рынку ў найбліжэйшыя два гады.

Распрацоўшчыкі запэўніваюць: сістэма больш адчувальная, чым сабачы нос, які, як вядома, можа лёгка выяўляць хворых людзей па паху. Сістэма ўзмоцнена штучным інтэлектам, які пастаянна развіваецца. Цалкам магчыма, што ў недалёкай будучыні ўрачы змогуць правяраць па дыханні наяўнасць 400 хвароб.